Паноў, С.В. Ставарэнне вобразаў гістарычных асоб як кампанента гістарычнай памяці (дыдактычны аспект) / С.В. Паноў // Роль личности в истории: реальность и проблемы изучения: науч. сб. (по материалам 1-й Международной научно-практической Интернет-конференции) / редкол. В. Н. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2011. – С. 166–171.

**С.В. Паноў (Мінск, РІВШ)**

# *СТВАРЭННЕ ВОБРАЗАЎ ГІСТАРЫЧНЫХ АСОБ ЯК КАМПАНЕНТА ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ (ДЫДАКТЫЧНЫ АСПЕКТ)*

Спалучэння сацыяльнага і дыдактычнага аспектаў гістарычнай памяці набывае актуальнасць ва ўмовах стварэння брэндаў беларускай нацыі, у т.л. з апорай на ролю асобы ў гісторыі. Такі рэбрэндінг будзе садзейнічаць не толькі самаідэнтыфікацыі навучэнцаў, а і забеспячэнню іх канкурэнтназдольнасці як прадстаўнікоў сучаснай беларускай нацыі, бо гістарычная памяць аб мінулым заўседы аднаўляецца праз прызму сучаснага і перспектывы будучыні. Для фарміравання гістарычнай памяці ў працэсе навучання аўтарам прадугледжваецца стварэнне вобразаў гістарычных асоб праз выкарыстанне метадычнага прыема комплекснай гісторыка-мастацкай характарыстыкі вывучаемых падзей.

Пад гістарычнай памяццю, якая мае мноства шматзначных вызначэнняў, будзем разумець усе віды інфармацыі аб падзеях мінулага, іх часе і месцы, удзельніках гістарычных падзей, а таксама здольнасць даражыць гістарычнымі традыцыямі свайго народа [6, с. 215]. Да таго ж гістарычная памяць разглядаецца не проста як канал перадачы пэўнай інфармацыі аб мінулым ад пакалення да пакалення, а як важнейшая складаючая пры выпрацоўцы нацыянальнай ідэнтычнасці. Нацыянальная ідэнтычнасць уяўляе сабой канкрэтную эмацыянальна-псіхалагічную, палітыка-ідэалагічную і культурную пазіцыю асобы, якая праяўляецца ва ўспрыняцці і ідэнтыфікацыі сабе ў навакольным асяроддзі з пункта гледжання прадстаўніка беларускай нацыі, якая мае глыбокія гістарычныя карані [1, с. 3-5].

Пры рэалізацыі гісторыяй, як вучэбнай дысцыплінай, ідэнтыфікацыйнай функцыі варта разгледзіць і знайсці магчымасці суаднесці два аспекты гістарычнай памяці: сацыяльны і дыдактычны. У сацыяльным аспекце гістарычная памяць (у той меры, у якой яна ўпісваецца ў гістарычную свядомасць грамадства) уяўляе сабой сукупнасць ведаў і масавых уяўленняў социума аб агульным мінулым [3, с. 38]. Магчымасці для фарміравання гістарычнай памяці як сацыяльнай узнікаюць пры рэалізацыі культуралагічнай парадыгмы адукацыі (М.М. Скаткін, І.Я. Лернер, В.В.

Краеўскі), згодна з якой змест адукацыі, у т.л. гістарычнай, разглядаецца як сацыяльны вопыт, якім валодаюць старэйшыя пакаленні. Згодна дадзенай парадыгме адукацыі, якая рэалізуецца ў межах сучаснай мадэрнізацыі навучальнага працэсу, веды ўяўляюць сабой усю назапашаную чалавецтвам інфармацыю аб свеце, у т.л. і аб способах дзейнасці [5, с. 146-147]. А ў дыдактычным аспекце пры трансляцыі сацыяльнага вопыту, назапашанага грамадствам, узнікае магчымасць яго засваення студэнтамі (школьнікамі) праз структураванне вучэбных гістарычных ведаў і выдзяленне ў іх тых, якія адлюстроўваюць ролю гістарычных асоб і матывацыю іх сацыяльных паводзін у розных гістарычных падзеях. Пры гэтым актуалізуецца магчымасць рэалізацыі антрапалагічнага крытэрыю адбору і канструявання зместу вучэбнага матэрыялу, які адпавядае т. зв. антрапалагічнаму павароту ў гістарычнай навуцы да асвятлення ролі чалавека як творцы гісторыі.

Магчымасці фарміравання гістарычнай памяці як сацыяльнай катэгорыі бачацца таксама ў выпадку рэалізацыі дыдактычнага прынцыпу культурна-гістарычнага асяроддзя пры адбары зместу навучання. Дадзены прынцып, які выцякае з культурна-генетычнай тэорыі Л.С. Выгоцкага, прадугледжвае азнаямленне навучэнцаў з дасягненнямі нашых продкаў у галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры. Згодна з дадзеным прынцыпам пры вывучэнні гістарычных падзей і характарыстыцы іх удзельнікаў найбольш эфектыўным з'яўляецца такое засваенне вучэбнага матэрыялу, пры якім актуалізуецца прадстаўленне аб магчымасці ці неабходнасці выкарыстання дасягненняў духоўнай і матэрыяльнай культуры, ідэй, поглядаў, вынаходніцтваў нашых папярэднікаў у жыццядзейнасці сучаснага чалавека.

Прынцып культурна-гістарычнага асяроддзя найбольш эфектыўна можа быць рэалізаваны, на нашу думку, пры стварэнні вобразаў гістарычных асоб і падзей. Пад такім вобразам разумеюцца ўяўленні аб кім ці чым-ліба, якія ўзнікаюць ў свядомасці навучэнца ў індывідуальным парадку, дзякуючы яго ўласнаму вопыту, а не толькі перадаюцца ў гатовым выглядзе [4, с. 22]. Пад вобразам гістарычнай падзеі таксама прынята разумець вынік і ідэальную форму яго адлюстравання у свядомасці чалавека і грамадства, якое ўзнікае ва ўмовах грамадска-гістарычнай практыкі на аснове і ў выглядзе знакавых сістэм [2, с. 264].

Фарміраванне ў вучняў вобраза гістарычнай асобы, яе ацэнка і разуменне разглядаюцца з пункта гледжання псіхалогіі як перцэпцыя, г. зн. працэс адбора, арганізацыі і інтэрпрэтацыі пачуццевых даных. Спецыфіка перцэпцыі заключаецца ў наяўнасці двух узаемазвязаных працэсаў – аттракцыі (далучэння) і эмпатыі (суперажывання). Гістарычная эмпатыя звязана з уменнем аднаўляць вобраз думак, перажываннняў, настрояў людзей мінулага з пазіцыі ўласцівай іх гістарычнаму часу сістэмы каштоўнасцей.

Такім чынам, пры стварэнні вобразаў гістарычных асоб і падзей з іх удзелам мэтазгодна звяртаць увагу на фарміраванне гістарычнай эмпатыі і прытрымліваца пры гэтым магчымасці атрактыўнага прадстаўлення дзеянняў (поглядаў) дзеячаў гісторыі і культуры. Такія вобразы гістарычных асоб, умоўна кажучы, не складзіруюцца ў нейкую віртуальную галерэю партрэтаў, а абумоўліваюць магчымасць карыстацца ідэямі і вынаходніцтвамі дадзеных асоб і вызначаць свае ўласныя адносіны да тактыкі і вынікаў іх дзейнасці.

Наша апытанне, прысвечанае вобразам гісторыі, якія першапачаткова складаліся і існуюць у свядомасці людзей, было праведзена сярод 90 настаўнікаў гісторыі ў сакавіку-красавіку 2011 г. Яго вынікі сведчаць аб тым, што вобразы гістарычных асоб і падзей маюць шматаспектны характар як кампаненты індывідуальнай і калектыўнай гістарычнай памяці. Так 33 % апытаных пералічылі канкрэтныя персаналіі, а 30 % – канкрэтныя помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, у т.л. помнікі дойлідства. У 21 % апытаных вобразы звязаны з асобай настаўніка гісторыі ці вывучэннем падручніка па гісторыі, а ў 16 % – са сведчаннямі сваіх родных і блізкіх. 25 % адказаў сведчыць аб актуальнасці гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. У 17 % апытаных адпаведныя вобразы першапачаткова складаліся ў сувязі з адзначэннем дзяржаўных ці народных святаў, у т.л. урачыстым прыемам у піянеры, удзелам у першамайскіх і кастрычніцкіх дэманстрацыях. Канешне, вынікі такога апытання можна лічыць часткова рэпрэзентатыўнымі і яно будзе праводзіцца і далей, але і яны даюць пэўнае ўяўленне аб механізме стварэння вобразаў і іх змястоўным напаўненні.

38 % апытаных назвалі тыя вобразы, якія сфарміраваліся, дзякуючы мастацкім сродкам (літаратура, кінематограф і інш.), што яшчэ раз падкрэслівае важнасць выкарыстання метадычнага прыема комплекснай гісторыка-мастацкай характарыстыкі вывучаемых падзей. Такі прыем прадугледжвае ужыванне твораў мастацтва як для адлюстравання гістарычных сюжэтаў, так і пазіцыі іх аўтараў, якая грунтуецца на пэўнай сістэме каштоўнасцей і перакананняў. Пры гэтым узнікае магчымасць параўнаць бачанне гістарычных падзей і паводзін іх удзельнікаў як з боку сведкаў і відавочнікаў, так і з боку нашчадкаў.

У якасці прыкладу можна прывесці сюжэт вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі 1917–1945 гг. для 9 класа (Сідарцоў У.Н., Паноў С.В., пад рэд. М.С. Сташкевіча. Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2006). У параграфе, прысвечаным Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і яе падзеям на Заходнім фронце і ў Беларусі, у рубрыцы «Культурна-гістарычнае асяроддзе» апавядаецца аб творчасці М. Шагала. У гэты час малады віцебскі мастак напісаў вядомую сёння ва ўсім свеце карціну «Над горадам». Гэта карціна –

сведка вялікай сілы кахання мастака да сваёй жонкі Бэлы. У 1918 г. М. Шагала прызначалі упаўнаважаным па справах мастацтваў у Віцебску. Ён займаўся мастацкім афармленнем Віцебска да гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, сам малюе палітычныя плакаты, сярод якіх «Мір хацінам, вайна палацам!» і інш. Віцебск быў упрыгожаны палотнамі зяленага колеру, бо такім чынам мастак вітаў Кастрычніцкія падзеі, якія ў яго свядомасці атаясаміліся з пачаткам новага жыцця. Дзеля выкарыстання зместу вышэйпрыведзенага матэрыялу навучэнцам прапануецца вызначыць месца творчасці М. Шагала ў сучасным культурна-гістарычным асяроддзі і магчымасці рэбрэндінга яго імя як прадстаўніка шматнацыянальнага беларускага этнасу.

У матэрыяле, прысвечаеым развіццю адукацыі і навукі ў БССР у 1920-я гады, варта было б згадаць пра дзейнасць расійскага і беларускага псіхолага, ураджэнца Оршы Л.С. Выгоцкага, які ўваходзіць у дзесятку самых вядомых псіхолагаў свету і якога называюць «Моцартам» псіхалогіі.. Пасля заканчэння ў 1917 г. юрыдычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэты ен працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў савецкай працоўнай школе ў Гомелі, затым у педагагічным тэхнікуме (цяпер педагагічны каледж, які носіць яго імя). У 1924 г. пераехаў на вучобу і працу ў Маскву. Аўтар арыгінальных навуковых тэорый, прысвечаных праблемам навучання і выхавання дзяцей. Лічыў, што эфектыўным з’яўляецца толькі тое навучанне, якое ідзе наперадзе развіцця асобы вучня і абумоўлівае яго вучэбную дзейнасць. Заснавальнік культурна-гістарычнай школы ў псіхалогіі. Называў сваю псіхалогію гістарычнай паколькі яна вывучае працэсы, якія ўзнікаюць у працэсе развіцця чалавечага грамадства і яго культуры. У дадзеным выпадку крытэрыям выбару асобы Л.С. Выгоцкага сталі як тапалагічныя, звязаныя з месцам нараджэння і працоўнай дзейнасці, так і навуковыя, што тычацца заснавання ім тэорыі развіццевага навучання, якая выкарыстоўваецца сення як кампанент сучаснага адукацыйнага асяроддзя ў нашай краіне.

У матэрыяле, прысвечаны правядзенню ў БССР індустрыялізацыі, размешчаны невялікі нарыс пра чалавека, якога назвалі «Леанарда XX стагоддзя», ураджэнца Гродзенскай губерні (цяпер тэрыторыя Польшчы). А.Л. Чыжэўскага. Пры стварэнні яго вобраза пераважаючым бачыцца не тапалагічны крытэрый, а той, што звязаны з выкарыстаннем у нашым сучасным кампутарна насычаным асяроддзі аднаго з яго вынаходніцтваў – «люстры Чыжэўскага», заснаванай на метадзе аэраіанізацыі – аздараўлення паветра адмоўна заражанымі іонамі. Добраахвотнікам ён у 1916 г. нядоўга ваяваў на адным з франтоў Першай сусветнай вайны, быў паранены і ўзнагароджаны салдацкім Георгіеўскім крыжом. У 1914 г., калі жыў у

Калузе, пазнаеміўся з К.Э. Цыялкоўкім і яго філасофскімі поглядамі. У 1917 г. закончыў Маскоўскі археалагічны інстытут з абаронай магістэрскай дысертацыі. Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. успрыняў як заканамерную з'яву. Ужо праз год у такі складаны перыяд часу, калі мала хто думаў аб навуцы, прадстаўляе да абароны доктарскую дысертацыю. Яе тэма была дастаткова сенсацыйнай - «Даследаванне перыядычнасці сусветна-гістарычнага працэсу». У дысертацыі вывучаўся ўплыў сонечнай актыўнасці на фізічнае і арганічнае жыццё на планеце Зямля, у т.л. на важнейшыя падзеі ў гісторыі чалавецтва. Дадзеная праца дазволіла заснаваць новыя навуковыя напрамкі: касмабіялогію і геліябіялогію.

Такім чынам, стварэнне вобразаў гістарычных персаналій у працэсе навучання праз выкарыстанне прыема комплекснай гісторыка-мастацкай характарыстыкі падзей, удзельнікамі якіх яны з'яўляліся, спрые сацыялізацыя асобы навучэнцаў праз фарміраванне ў іх гістарычнай памяці як сукупнасці ўяўленняў і ведаў аб мінулым і як асновы пачуцця гонару за культурна-гістарычныя дасягненні беларускага народа, ужываемыя для аналіза выпускнікамі сацыяльнай рэчаіснасці і прагназіраванні ўласнай жыццядзейнасці.


1. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: ХХ стагоддзе / М.П. Касцюк [і інш.]; рэдкал. : А.А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 615 с.
2. Сидорцов, В.Н. Беларусь в ХХ веке : нетрадиционное представление истории: Монография / В.Н. Сидорцов, И.А. Кандыба, М.М. Равченко / Под ред. В.Н. Сидорцова. – М. : МАКС Пресс, 2010. – 272 с.
3. Соколова, М.В. Что такое историческая память? / М.В. Соколова // Преподавание истории в школе. – 2008. – № 7. – С. 37 – 44.
4. Стрелова, О.Ю. Образы – мифы – фальсификации / О.Ю. Стрелова // Преподавание истории и обществознания в школе. – 2010. – № 8. – С. 22 – 25.
5. Теоретические основы содержания общего среднего образования / Под ред. В.В. Краевского, И.Я. Лернера. – М. : Педагогика, 1983. – 352 с.

Яценко, Н.Е. Обществоведческий словарь / Н.Е. Яценко. – СПб. : Издательство «Лань», 2006. – 672 с.